View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Пуцік У.С.
г. Мінск

# Стварэнне філіялаў партыі “Саюз 17 кастрычніка” ў Паўночна-Заходнім краі (1905—1907 гг.)

Разлажэнне традыцыйнага саслоўнага ладу ў Расійскай імперыі ў другой палове XIX ст, абвастрэнне сацыяльных і палітычных супярэчнасцяў, уздым грамадскага руху, які ў 1905-1907 гг. перарос у рэвалюцыю, садзейнічалі хуткаму ўзнікнення палітычных партый і аб’яднанняў насельніцтва з мэтаю абароны сваіх інтарэсаў. Шырокае партыйнае будаўніцтва пачынаецца пасля выдання маніфеста 17 кастрычніка 1905 г., які абвяшчаў легальнае існаванне грамадскіх палітычных інстытутаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У савецкай гістарычнай навуцы гісторыя палітычных партый была найменьш распрацаванай і найбольш фальсіфіцыраванай. Панавала ленінская класіфікацыя палітычных партый, у аснове якой знаходзіўся спрошчаны класавы падыход. Савецкія гісторыкі імкнуліся абгрунтаваць заканамернасць і гістарычную абумоўленасць непазбежнага шляха паслярэвалюцыйнай Расіі да монапартыйнай сістэмы. Любыя іншыя альтэрнатывы адвяргаліся і аб’яўляліся тупіковымі.

Толькі ў постсавецкі перыяд у расійскай і беларускай гістарыяграфіі з’явіліся даследаванні па гісторыі асноўных палітычных партый, з якіх трэба вызначыць працы М.В. Біча[1], М.С. Сташкевіча[2], М.М. Забаўскага[3], А.Ф. Смалянчука[4], В.Е. Казлякова[5], К.М. Бандарэнка[6], Дз.С. Лаўрыновіча[6, 12] і інш. На сучасным этапе беларускія і расійскія даследчыкі робяць намаганні, каб крытычна перагледзець факталагічны матэрыял савецкай гістарыяграфіі, зрабіць яго адпавядаючым рэчаіснасці, вяртаюцца да першакрыніц.

У цэнтры расійскага палітычнага спектра, які склаўся на рубяжы вякоў, знаходзіліся рухі і партыі ліберальнага кірунку. У аснову праграмы расійскага

лібералізму былі закладзены традыцыйныя ліберальныя вартасці: вяршэнства закону, забеспячэнне асноўных грамадзянскіх і палітычных правоў і свабод для ўсіх, як абавязковая ўмова матэрыяльнага, інтэлектуальнага, маральнага прагрэсу ў грамадстве; у эканоміцы – акцент на ўсеагульнае вызаленне гаспадарчай ініцыятывы, умацаванне інстытута прыватнай уласнасці і г.д. Аднак разам з тым сваю асноўную задачу ідэолагі рускага лібералізма бачылі у тым, каб максімальна адаптаваць уласную палітычную і эканамічную праграму ў адносінах да нацыянальна-своеасаблівых умоў Расіі.

На правым фланзе гэтага цэнтра знаходзілася партыя «Саюз 17 кастрычніка» (акцябрысты), якая прытрымліваліся ліберальна-кансерватыўных поглядаў і ў адрозненне ад кадэтаў была рашучым праціўнікам прымянення рэвалюцыйнага насілля.

Як палітычная плынь акцябрызм з’явіўся і пачаў арганізацыйна афармляцца на аснове «меншасці» земска-гарадскіх з’ездаў. Партыйнае размежаванне ў ліберальным лагеры ў асноўным закончылася пасля выдання маніфеста 17 кастрычніка 1905 г.

Арганізацыйна «Саюз 17 кастрычніка» пачаў складвацца ў апошнія дні кастрычніка 1905 г., калі ў Маскве, а потым і ў Пецярбургу адбылося некалькі сустрэч ліберальных земцаў з прадстаўнікамі буйной буржуазіі. Акрамя распрацоўкі праграмных пытанняў на гэтых нарадах ішло фарміраванне кіруючых органаў Саюза — Маскоўскага і Пецярбургскага аддзяленняў ЦК.

Акрамя аддзяленняў Цэнтральнага камітэта, у склад якога ўжо да пачатку 1907 г. уваходзілі звыш 70 чалавек, да канца 1905 г. у абедзвюх сталіцах былі створаны Гарадскія саветы “Саюза 17 кастрычніка”, якія кіравалі дзейнасцю раённых партыйных арганізацый, а таксама дзейнасцю 60 аддзелаў Саюза на месцах. Усяго ў 1905—1907 гг. канстытуіравалася 260 аддзелаў «Саюза 17 кастрычніка», прычым асноўная частка (каля 200) узнікла ў перыяд выбараў у I Думу. Агульную колькасць членаў партыі ў гады першай рэвалюцыі можна вызначыць у 75—77 тыс. чалавек. Мясцовыя аддзелы акцябрыстаў лёгка распадаліся і гэтак жа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лёгка ўзнаўлялі сваю дзейнасць у перыяд выбарчых кампаній з тым, каб зноў спыніць яе на час працы чарговай Дзяржаўнай думы.

Геаграфічна пераважная большасць мясцовых аддзелаў «Саюза 17 кастрычніка» з’явілася ў земскіх губернях Еўрапейскай Расіі з адносна развітым дваранскім землеўладаннем. У няземскіх губернях, асабліва на нацыянальных ускраінах імперыі, колькасць акцябрысцкіх арганізацый была невялікай. Крыху большай была колькасць акцябрысцкіх аддзелаў, створаных у сельскай мясцовасці, — усяго прыкладна 30 [7, с. 7].

Арганізацыйна «Саюз 17 кастрычніка» быў задуманы як «аб’яднанне ўсіх партый цэнтра, незалежна ад іх другарадных адрозненняў і адценняў», а таму быў вельмі рыхлым утварэннем. З самага пачатку ў акцябрысцкім асяродку атрымала распаўсюджанне дапушчанае статутам паралельнае членства ў іншых партыях і арганізацыях. Як правіла, у «Саюз 17 кастрычніка» ўступалі людзі сталага ўзросту і высокага адукацыйнага цэнзу з даволі вызначаным і салідным грамадскім становішчам. Большасць акцябрыстаў належала да пакалення, што дало расійскаму вызваленчаму руху цэлую плеяду рэвалюцыянераў-«васьмідзесятнікаў».

Праграма «Саюза 17 кастрычніка» распрацоўвалася з лістапада 1905 г., калі быў выдадзены першы яе варыянт. На I з’ездзе «Саюза 17 кастрычніка» (люты 1906 г.) праграма была прынята ў значна пашыраным і дапрацаваным відзе, а на II з’ездзе (май 1907 г.) — падвергнута некаторай рэдакцыйнай апрацоўцы.

Цэнтральнае месца ў праграме «Саюза 17 кастрычніка» займала пытанне пра характар і структуру дзяржаўнай улады ў Расіі. Яе другі раздзел быў прысвечаны патрабаванням партыі ў галіне грамадзянскіх правоў.

Вялікая ўвага ў праграме надавалася сацыяльным пытанням, сярод якіх на першым месцы стаяла аграрнае, названае «самым вострым, самым балючым пытаннем у прасторы амаль ўсёй вялікай Расіі». Акцябрысты ўсведамлялі, наколькі цяжкім было становішча малазямельнага сялянства, і, больш таго, знаходзілі патрабаванні сялян пра павелічэнне надзелаў цалкам справядлівымі. Задаволіць іх акцябрысты прапаноўвалі, па-першае, за кошт дзяржавы ў выніку

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раздачы сялянам цераз асобыя зямельныя камітэты пустых казённых, удзельных, кабінецкіх зямель, і, па-другое, шляхам «садзеяння куплі сялянамі зямель у прыватных уладальнікаў» пры пасрэдніцтве Сялянскага банка. У крайніх выпадках праграма «Саюза 17 кастрычніка» прадугледжвала і «прымусовае адчужэнне» часткі прыватнаўласніцкіх зямель з абавязковым узнагароджаннем уладальнікаў. Выкупіць зямлю, падкрэслівалі акцябрысты, звяртаючыся да сялян, «трэба па справядлівай ацэнцы і без урону для памешчыцкай гаспадаркі».

У вырашэнні аграрнага пытання акцябрысты ішлі ў русле ўрадавай аграрнай палітыкі. Акцябрысты разлічвалі на тое, што яны здолеюць з дапамогай разбурэння абшчыны ў адносна кароткі тэрмін стварыць шырокі пласт заможнага сялянства, якое і павінна было стаць масавай апорай рэжыму[8, с. 345-348].

Узнікненне аддзелаў «Саюза 17 кастрычніка» ў беларускіх губернях прыпадае на канец 1905 — пачатак 1906 гг. Так, у снежні 1905 г. узніклі аддзелы ў гарадах Вільна, Вілейка, Свянцяны, Віцебск, Мінск, Гомель, вёсках Варкава, Вышка, у студзені 1906 г. рэгіструюцца аддзелы ў Гродна, Двінску, Крэслаўлі, Крыванах, Лепелі, Магілёве, Бабруйску, Любонічы. На момант усталявання аддзелаў колькасць іх членаў была невялікай, як правіла, у кожным ад 100 да 300 чалавек. Выключэннем быў аддзел у Двінску, дзе па даных архіваў налічвалася 3256 чалавек [9, с. 155—160].

Арганізатарамі аддзелаў «Саюза 17 кастрычніка» выступалі ў асноўным мясцовыя рускія чыноўнікі, памешчыкі, праваслаўныя святары. Мясцовыя акцябрысты, у адрозненне ад сталічных, адвяргалі любыя пагадненні з аўтанамістамі і крытыкавалі іх у сваіх органах друку.

Лідэрам акцябрыстаў у заходніх губернях з’яўляўся Г.К. Шмідт. Ён арганізаваў у Мінску ў канцы 1905 г. аддзел «Саюза 17 кастрычніка». Аддзел знаходзіўся пад апекай мясцовай адміністрацыі, а газета «Минская речь» карысталася значнай падтрымкай у падачы інфармацыі. Для гэтага за кароткі час, на падставе становішча аб надзвычайнай ахове, былі забаронены чатыры газеты ліберальнага на-кірунку. Першым практычным крокам мінскіх акцябрыстаў было

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

накіраванае імператару і ўраду хадайніцтва аб неабходнасці стварэння на ўскраінах «рускіх» выбарчых курый з тым, каб мясцовае «рускае» насельніцтва мела асобнае прадстаўніцтва ў Думе [3, с. 18].

Усталяванне акцябрыстаў у Магілеве адбылося 15 студзеня 1906 г. на агульным сходзе Магілёўскага філіяла расійскай Прагрэсіўнай партыі, які ўзнік яшчэ ў жніўні 1905 г. Пасіўнае існаванне не задавальняла яго членаў. Ужо ў снежні было вырашана змяніць тактыку, а разам і назву партыі. Выбраны сходам старшыня князь М. Друцкі-Сакалінскі азнаёміў прысутных з праграмамі «Саюза 17 кастрычніка», «Торгово-Промышленной партии», «Умеренно-Прогрессивной», «Партии Правового Порядка». Была прынята прапанова, што бліжэй за ўсіх да праграмы Прагрэсіўнай партыі знаходзіцца праграма акцябрыстаў, і было прынята рашэнне аб сумесным выступленні ў перыяд выбараў мясцовых аддзелаў «Саюза 17 кастрычніка» і Прагрэсіўнай партыі.

Прадстаўнікі ад беларускіх губерняў прымалі ўдзел у рабоце амаль усіх агульнарасійскіх з’ездаў, агульных сходаў і пасяджэннях ЦК «Саюза 17 кастрычніка». Так, ў пасяджэнні цэнтральнага камітэта ад 2 снежня 1905 г. прыняў удзел мінскі губернатар А.А. Мусін-Пушкін, які на гэтым пасяджэнні запэўніў, што «бярэцца пабудаваць у Мінску мясцовы камітэт разам з Шыманскім». Для хутчэйшага вырашэння справы прапанаваў дарам кватэру [7, с. 3].

У пасяджэннях першага агульнарасійскага з’езда, які праходзіў з 8 па 12 лютага 1906 г. ў Маскве, прынялі актыўны ўдзел прадстаўнікі ад беларускіх губерняў. У невялічкай прамове па аграрным пытанні Г.К. Шмідт зазначыў, што аднародны склад з’езду і ўвогуле партыі не дазваляе пакуль прымаць на сябе адказнасць за вырашэнне гэтага пытання, што ад яго залежыць, ці застануцца ў саюзе шматлікія аддзяленні ў Паўднева-Заходнім і Паўночна-Заходнім краі [7, с. 118].

Далей прадстаўнікі Мінскай губерні І.Д. Чыгіраў і Г.К. Шмідт пратэставалі супраць пытання аб адмене ваеннага становішча і засяродзілі ўвагу на тым, што адзінай задачай з’езда з’яўляецца вырашэнне пытання пра хадайніцтва аб хутчэйшым скліканні Думы [7, с. 123]. Трэба адзначыць, што менавіта Шмітд і прад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

стаўнік ад Вільні Н.Ю. Мацон засяродзілі ўвагу дэлегатаў на патрабаванні ад урада вырашыць пытанне аб раўнапраўі для рускага насельніцтва ўскраін і аб неабходнасці мець у Думе свайго прадстаўніка. Мацон папярэджваў, што калі справа не будзе зменена на карысць рускага насельніцтва краю, то “праз пяць год можа так здарыцца, што на акраінах не застанецца ні аднаго рускага чалавека” [7, с. 140].

Рэзалюцыя першага з’езда па сялянскаму і зямельнаму пытанням была прынята з улікам меркаванняў прадстаўнікоў ад Паўночна-Заходняга краю: 1. Прызнаць пажаданым усталяванне пры ЦК камісіі для распрацоўкі зямельнага пытання ў развіцці праграмы «Саюза...» 2. Хадайнічаць перад урадам аб неадкладным усталяванні ўрадам пры павятовых земскіх управах (там, дзе іх няма самастойна) павятовых землеўладкавальных камісій... [7, с. 161].

Аналізуючы становішча ў Заходнім краі, кадэцкая «Речь» 19 сакавіка 1906 г. адзначала: «...наўрад дзе-небудзь “Саюз 17 кастрычніка” меў такі чарнасоценны склад». Так, ў Вільні 27.01.1905 г. адбыўся аб’яднальны сход акцябрыстаў і «Северо-Западного русского Веча». Карэспандэнт газеты «Новая заря» паведамляў, што гарадская зала была перапоўнена ў большай частцы членамі і дэлегатамі з’ездаў стараабрадцаў і праваслаўнага святарства. Старшыня сходу А.В. Бялецкі адзначыў вялікую ролю стараабрадцаў Паўночна-Заходняга краю ў барацьбе за чыста рускія ідэі, падзякаваў праваслаўнае святарства за справу ўкаранення ў грамадскасць пачаткаў рускага грамадзянства. Усе выступаючыя заклікалі да яднання і абароны рускіх інтарэсаў у краі, аб усталяванні адпаведнага цэнтра, заснаванні рускай газеты [11, с. 3]. «Северо-западный голос» № 83 ад 21.03.1906 г. паведаміў, што 19 сакавіка адбыўся агульны сход беспартыйных рускіх людзей. Сярод прысутных было шмат правых, якія групаваліся вакол «Саюза 17 каст-рычніка», «Русского Собрания и Русского Веча» [11, с. 3]. Пачын Заходняга краю аб стварэнні блока акцябрыстаў і правых хутка распаўсюдзіцца на ўсю імперыю. У сваю чаргу лістападаўскі з’езд упаўнаважаных дваранскіх таварыстваў таксама выказваўся за больш цеснае супрацоўніцтва з акцябрыстамі. У канцы блокі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

акцябрыстаў з чарнасоценцамі, раней даволі рэдкія, на выбарах ў II Думу сталі, па сутнасці, правілам.

Пазней пад уплывам акцябрыстаў там жа ў Вільні быў утвораны Саюз рабочых для барацьбы з забастоўкамі, які спрабаваў пераканаць рабочых ў тым , што забастоўкі прыносяць толькі шкоду і вядуць да росту беспрацоўя. Саюз заклікаў змірыцца з нізкай зарабатнай платай і спадзявацца на будучыню [12, с. 34]

Правал першай выбарчай кампаніі выклікаў дэзарганізацыю «Саюза 17 кастрычніка» і распад мясцовых акцябрысцкіх аддзелаў. Калі ў працах I з’езда партыі прынялі ўдзел прадстаўнікі ад 95 мясцовых арганізацый, то на II з’ездзе дэлегатамі былі прадстаўленыя толькі 22 з іх [7, с. 17].

Такім чынам, акцябрысты, як і іншыя блізкародныя партыі, у Беларусі мелі свае філіялы, якія, як і сама партыя, заставаліся аморфнымі ўтварэннямі без дакладна акрэсленай структуры і арганізацыйнай пабудовы. Яе ўплыў у Паўночна-Заходнім краі распаўсюджваўся сярод чыноў урадавай адміністрацыі, праваслаўнага святарства, буйных памешчыкаў рускага паходжання. І тым не менш эканамічнае, фінансавае і сялянскае пытанні ў іх праграме не толькі знаходзіла сваё адлюстраванне з улікам гістарычнага часу, але і ў большай ступені, чым у праграмах іншых партый, набліжаліся да тых шляхоў вырашэння, якія адпавядалі інтарэсам дзяржавы і грамадства і ў той жа час прадухілялі магчымыя катастрафічныя разбурэнні. А гэта азначае, што акцябрысцкая праграма была менш палітызаваная і эканамічна больш абгрунтаваная. У выніку рэвалюцыі 1905−1907 гг. лібералы здолелі вызначыць і выразіць погляды эліты грамадства Расійскай імперыі, і трэба прызаць, што іх погляды і дзейнасць садзейнічалі распрацоўцы палітычных, сацыяльна-эканамічных і культурных патрабаванняў, якўя адкрылі шлях да прагрэсу краіны [13, с. 10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Літаратура


1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. Ч. 1. / М.В. Біч [і інш.]; пад рэд. М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.
2. Сташкевіч, М.С. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец XIX ст. - люты 1917 г.) / М.С. Сташкевіч // Беларускі гістрычны часопіс. – 1999. – № 3. – С. 18-23.
3. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906–1917 гг.) / М.М. Забаўскі — Мінск: БДПУ, 1999. — 212 с.
4. Смалянчук, А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А.Смалянчук — СПб., Неўскі прасцяг, 2004. — 406 с.
5. Козляков, В.Е. Национальный вопрос и неонароднические партии. Начало XX в. — конец 20-х гг. (На материалах России, Беларуси, Украины). / В.Е. Козляков. — Минск: БГТУ, 2001. — 247 с.
6. Бондаренко К.М, Лавринович Д.С. Русские и белорусские монархисты в начале XX века: Монография. / К.М. Бондаренко, Д.С. Лавринович —Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. — 212 с.
7. Партия «Союз 17 октября». Протоколы съездов, конференций и заседаний ЦК: В 2 т. — М.: РОССПЭН, 1996. — Т. 1.: Протоколы съездов и заседаний ЦК. 1905—1907 гг. — 408 с.
8. Программы политических партий России. Конец XIX–XX в. – М.: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 1995. — 464 с.
9. Политические партии России в период революции 1905—1907 гг.: Количественный анализ: Сб. ст. / АН СССР. Ин-т истории СССР. — М., 1987. — 243 с.
10. Объединительное собрание «Союза 17 октября» и «Северо-Западного Русского Вече» // Новая заря. — 1906.— 27 янв. — С. 3.
11. Общее собрание Виленского отдела «Союза 17 октября» // Белая Русь.


РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

— 1906. — 22 февр. — С. 1.

12. Лаўрыновіч, Д.С. Віленскія акцябрысты і іх саюзнікі ў пачатку XX ст. / Д.С. Лаўрыновіч // Весці БДПУ. Серыя 2, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2007. – № 4. – С. 33–36.

13. Фамін В.М. Радыкалізацыя ліберальна-апазіцыйнага руху на этапе ўздыму першай расійскай рэвалюцыі (студзень-кастрычнік 1905 г.) / В.М. Фамін // матэрыялы Рэсп. навук. канф. Мінск, 27 кастр. 2005 г. – Мінск: БДПУ, 2005. – С. 6–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ